Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 39 (68) Аўторак, 20-га сьнежня 1927 г. м. Вільня. II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару

Нацыянальнае адраджэньне. — Тэрытарыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія. — Зямля сялянам на падставе уласнасьці. — Шырок дэмократызм. — Барацьба з комунізмам. — Нацыянальная царква. — Краевая згода. — Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
" " " 3 " 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
" У тэксце . —40 гр.
" На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Да згоды і еднасьці!

Выбары у Сойм і Сэнат блізяцца. Ужо распачалася перадвыбарчая праца, агітацыя і барацьба. Рожныя польскія партыі еднаюцца, твораць рожныя комбінацыі і аб'еднаньні.

Толькі беларусы *пакуль што* ідуць разьбіта асобнымі групамі. Праўда, ўжо пачынаюць паўставаць выбарчыя камітэты, але няма самага галоўнага — *няма аб'еднаньня беларусаў*!

У папярэднім нумары мы адкрыта клікалі да згоды і еднасьці ўсіх беларусаў пад *адзіным нацыянальным сьцягам*. Аднак-жа гэтай згоды, гэтага аб'яднаньня няма.

Праўда наступіла аб'яднаньне Сельсаюзьнікаў, хадэкаў і нікаму яшчэ няведамага „Бел. Праваслаўнага Дэм. Аб'яднаньня" з немцамі, часткай украінцаў і часткай жыдоў. Стварылася гэтак кажучы старая 16-ка, толькі пакуль што маленечкая. Але мы зазначалі і зазначаем, што перад тым, як з кім колячы уваходзіць у якія-небудзь выбарчыя комбінацыі, трэба беларусам аб'яднацца перад ўсім самім. На тое места сельсаюз і хадэкі ствары́лі ўжо „Беларускі цэнтральны (?) выбарчы „аб'яднаны" камітэт". Гэты „цэнтральны" выбарчы камітэт ёсьць копіяй гэтак скандальна правёўшага выбары да Віленскай Рады камітэту таго-ж недошлага раднага Ярэміча. Навіна у гэтым камітэце тая, што хадэкі бяруць у ім адкрыты удзел і далучыўся да камітэту ад неба адарваўшыся і да зямлі не дастаўшы ех-грамадавец Сабалеўскі, якому страшэнна хочацца зноў трапіць у паслы.

Дык мы зноў падкрэсьліваем, што сельсаюз Ярэміча-Рагулі, нічога не зрабіўшы для фактычнага аб'ядналньня беларусаў, бо спачатку злучыўся з чужынцамі (немцамі і жыдамі), а потым дапусьціўся фальшу, крычучы аб якімсь "*аб'ядналым*" камітэце, у якім няма як левых радыкальных беларускіх груміровак, так і умяркаваных нацыянальных.

Проста гэта старая прыяцельская супалка хадэкаў і сельсаюзу, маючая лёкальнае значэньне. Але, калі прыняць пад увагу, што сярод хадэкаў, увайшоўшых у гэты камітэт, не хапае лідэра і складаючага нязьмерыма моцную хадэцкую адзінку кс. А. Станкевіча, — а роўным чынам і другога лідэра — кс. Гадлеўскага, дык камітэт гэты траціць нават тую павагу, якую ён меў-бы пры ўдзеле гэтых лідэраў хадэкаў.

Мы праконаны, што ніякія комбінацыі і надзеі на саюзьнікаў па блёку, як жыды (бо немцаў і украінцаў на землях нашых амаль зусім няма) без папярэдняго аб'яднаньня беларусаў добрага рэзультату для блёку меншасьцяў, а тым балей для беларусаў не дадуць. Сэкрэтам вялікага пасьпеху папярэдняй 16-ткі на беларускіх землях, якая дала 11 бел. паслоў і сэнатараў і зусім неспадзяваныя мандаты жыдам (як два мандаты з Наваградчыны!) было тое, што беларусы ішлі агульна-аб'яднаным фронтам у гэтай 16-цы.

Ня было тагды ані воднага іншага беларускага сьпіску, апрача беларускага сьпіску, які йшоў у 16-цы. Праўда знайшліся здраднікі беларусы, як Міткевіч, Дзяргач і інш., якія прабавалі разьбіваць беларускую еднасьць, пайшоўшы з польскім краёвым сьпіскам № 22, але нават тагды народ не даў сябе ашукаць і гэты сьпісак праваліўся.

Дык у зразуменьні таго, што разьбіцьце беларускай еднасьці гібельна адзавецца на лічбе будучых беларускіх паслоў, мы зноў клічам ўсё беларускае грамадзянства да згоды і еднасьці!

Мы зварачваем гэты свой голас перад усім да усіх палітычных групаў і партыяў. А калі партыі гэтыя пад кіраўніцтвам гэнэралаў б. паслоў гэтак далёка адыйшлі ад народу, што ня ведаюць *таго, што народ хоча, чакае і трэбуе гэткага аб'яднаньня*, — дык мы зварочваемся з гэтым клічам да тых новых народных выбранцаў, якіх народ паслаў бараніць ягоныя інтарэсы у самаўрад!

Вы, браты радныя, не дапусьціце разьбіцьця галасоў вашых выбаршчыкаў! Выбары да самаўраду паказалі Вам, што там, дзе беларусы былі зьеднаны і з'арганізаваны пад нацыянальным сьцягам — (нават пры поўных рожніцах партыйных!), там беларусы атрымалі большасьць у гмінах, там мы маем сваіх першых беларускіх войтаў.

Дык Беларусы!

Мы, беларускія нацыяналісты, клічам ўсіх праўдзівых, шчырых беларускіх дзеячоў, як палітычных, так грамадзкіх і культурных! Споўніце свой абавязак перад народам!

Тварыце адзіны беларускі нацыянальны выбарчы фронт!

Палітычны агляд.

Наколькі папярэдняя сэсія Рады Лігі Народаў была зусім няпрыметная, патолькі цяпер яна зацікавіла ўсю Эўропу двума наступнымі фактамі:

удзелам савецкай дэлегацыі ў камісіі па разбраеньню і візытаю Маршалка Пілсудзкага.

Што датычыць да праблемы разбраеньня, якая ня сходзіць з дзеннага парадку міжнарадовай палітыкі пасьля сьвятовай вайны, дык наўрад знойдзецца хоць адзін рэальны палітык, які верыў-бы ў магчымасьць вырашэньня гэтай праблемы. Аднак-жа час ад часу сучасныя дыплёматы і палітыкі зьвяртаюцца да гэтай справы, каб пасьля супольных гутарак у Жэнэве ці іншым месьце разьехацца з новым пасьвядчэнем, што перашкоды на шляху да агульнага разбраеньня не пераможны. Але на гэты раз жэнэўскія гутаркі аб разбраеньні заслугоўваюць на ўвагу зусім па іншым матывам:

у іх першы раз прыймала удзел савецкая дэлегацыя.

Гэты факт вельмі характэрны. Па-першае, праблема агульнага разбраеньня можа быць вырашана толькі ў тым выпадку, калі пастанове Лігі Народаў аб разбраеньні падпарадкуюцца ўсе бяз вынятку вялікія дзяржавы. Перашкодаю ў гэтым кірунку была толькі Радавая Расея, якая байкатуе Лігу Народаў, як буржуазную інстытуцыю і ўсе яе пастановы. Вось з гэтага боку і цікавы першы ўдзел савецкай дэлегацыі, на чале якой стаяў заступнік Чычэрына Літвінаў у Жэнэўскай конфэрэнцыі аб разбраеньні. I каб не даваць бальшавікам лішніх козыраў у рукі проці буржуазна-культурных дзяржаваў, апошнія неаднаразова давалі бальшавікам да зразуменьня, што іх удзел у міжнарадовых конфэрэнцыях, роўным чынам як іх уступленьне да Лігі Народаў пажаданы. Бальшавікі-ж па рожным матывам увесь час адмаўляліся. Праўда гэта праісходзіла не бяз упльву нямецкай дыплёмацыі, якой залежыць на тым, каб інтрыгаваць Заходню Эўропу, не дапушчаючы яе да згоды з Бальшэвіяю. Але той моцна памыліцца, хто дапусьціць, што ў нямецка-бальшавіцкіх палітычных плянах наступіў які-небудзь пералом і што савецкая дэлегацыя прыехала да Жэнэвы пасьля візіты ў Бэрліне з шчырым жаданьнем цеснага супрацоўніцтва з буржуазным сьветам. Бальшавікі прыбылі да Жэнэвы па двум прычынам: па-першае, яны хацелі навязаць безпасрэдні контакт з Чэмбэрленам і Брыянам, каб направіць зусім сапсаваўшыяся адносіны Радавай Расеі з Англіяй і Францыяй, і па-другое, каб выкарыстаць жэнэўскую міжнарадовую трыбуну для звыклай бальшавіцкай агітацыі перад сьвятовым пралетарыятам. Зусім іншая рэч, ці дапялі яны гэтых мэтаў. Праўда Літвінаву пашанцавала асабіста спаткацца з Чэмбэрленам пры пасрэдстве літоўскага прэм'ера Вальдэмараса і адбылася нейкая тайная нарада. Але з гэтай нарады нічога ня выйшла, роўным чынам, як і прамова Літвінава на пленарным паседжаньні конфэрэнцыі на тэму агульнага разбраеньня не зрабіла іншага ўражаньня апрача зьдзіўленьня.

Усім добра ведама, што бальшавікі, спэкулюючы гэткімі высокімі лёзунгамі, як мір, вольнасьць, роўнасьць і разбраеньне, зрабілі добры інтэрас: ашукалі расейскі народ, захапілі ў свае крывавыя рукі ўладу і цяпер дзеля таго толькі, каб утрымаць гэтую ўладу, не застанаўляюцца перад такімі подласьцямі і праступленьнямі, якіх сьвет ня бачыў да гэтай пары. Літвінаў прыехаў у Жэнэву з гатовым савецкім праэктам разбраеньня, у корні мінуючымся з агульна-сьвятовымі паглядамі на гэта пытаньне, ў сваей нахальнай прамове ўзасадняў гэты проэкт, але зразумела нікога з слухачоў не перakaнаў і вярнуўся да Масквы з пустымі рукамі і разьбітымі надзеямі, даставіўшы толькі масу клопатаў жэнэўскай паліцыі, якая хадзіла па пятам маскоўскіх катаў, каб ня мець новай няпрыемнасьці, як з Вароўскім.

Зусім іншае значэньне мае

ліквідацыя польска-літоўскага канфлікту,

цягнуўшагася бязупынна ад 1920 г. У цэлай Эўропе ня было больш ненармальнага стану, як на польска-літоўскай граніцы:

„ні мір, ні вайна".

З аднаго боку літоўскія мегаломаны з асьлінаю ўпартасьцю крычэлі на ўвесь сьвет, што Літва ня можа адрачыся ад сваей гістарычнай сталіцы Вільні і што не памірыцца з Польшчаю да тэй пары, пакуль не атрымае Вільні. З другога боку заяўлялі, што „Літва знаходзіцца ў стане вайны з Польшчаю" і дзеля гэтага адмаўляліся ад узнаўленьня нармальных дыплёматычна-гандлёвых адносінаў з Польшчаю. Праўда падобныя канфлікты істнуюць у Эўропе і між іншымі дзяржавамі. Але ў гэткай форме, каб цэлыя гады стаяла нейкая „Кітайская сьцяна" між дзяржавамі, нідзе няма. Бязумліву гэткі стан няпэўнасьці і сталай напружаннасьці дыплёматычных адносінаў некаму патрэбны быў. Калі-б за сьпіною Літвы не стаяў нехта трэці, яна-бы не жартавала гэтак словам „вайна", бо-ж ня можа з сваімі сіламі вязьці вайны з Польшчаю. У 1920 г. яна спрабавала, як можа ўласнымі сіламі трымаць Вільню. Добра, што Польшча не трактавала паважна гэтых слоў ковенскіх застрэльшчыкаў і не адказала на гэты вызаў тым-жа г. зн. не распачала ў адпаведны момэнт маршу на Коўну. „Калі вайна, дык вайна"... Можна было ў любы момэнт без усялякай перасьцярогі распачаць ваенныя дзействы.

Але што з гэтага выйшла-бы? Зусім магчыма, што Эўропэйская апінія не апраўдала бы гэткага кроку з боку Польшчы, бо ня ўсе хочуць гуляць з вагнём.

I вось, калі вялікія Эўропэйскія дзяржавы пераканаліся нарэшце ў тым, што Літва бязумоўна гуляе ролю нейкай лялькі ў руках трэцяй стараны, для якой залежала на тым, каб падтрымліваць стан няпэўнасьці, рашылі палажыць гэтаму крыжык. Выдача Польшчы апошняй саліднай пазычкі служыць лепшым доказам таго, што наступіла перамена ў апініі Эўропы ў адносінах да польска-літоўскага конфлікту. Калі-б гэты стан няпэўнасьці заставаўся надальш, амэрыканска-эўропэйскія фінансісты не зрызыкавалі-бы на гэтую пазыку.

Гэткім чынам дасьпеў момэнт для ліквідацыі польска-літоўскага конфлікту, які ў апошні момэнт дасягнуў кульмінацыйнага пунку, дзякуючы правакацыйным прыёмам ковенскіх дыктатараў і пагражаў пераходам у сапраўдную вайну. Гэтая комэдыя абрыдла нарэшце, і Польшчы. Вось дзеля чаго да Жэнэвы выехаў сам Маршалак Пілсудзкі, які асабіста хацеў пачуць з вуснаў Вальдэмараса перад сьведкамі адказ на пытаньне: „вайна ці мір"?, каб потым не абвінавачывалі Польшчу ў яе агрэсыўнасьці. I Вальдэмарас, прыпёрты да сьценкі гэтай рашучасьцю польскай дыплёмацыі, маючай за сабою эўропэйскую апінію, мусіў без усялякіх далейшых увертак даць выразны адказ: „м і р"!

Адтрымаўшы гэты адказ, Маршалак заявіў: „больш мне тут рабіць німа чаго", і той час выехаў з Жэнэвы.

Трэба адзначыць і надзвычай рашучую пастанову Рады Лігі Народаў, як пасрэдніцы ў гэтым конфлікце, якой гэтак сама абрыдла глядзець на гэтую комэдыю. I яна запрапанавала простую, але рашучую рэзалюцыю: „Стан вайны мусіць той час быць спынены. Павінны быць навязаны дыплёматычныя адносіны. Польшча гарантуе тэрыторыяльную нятыкальнасьць і палітычную незалежнасьць Літвы, як слабейшай, а рэшта Лігі Народаў не датычыць. Як там вырашыце свае спрэчныя справы, гэта залежыць ад вас саміх"... А каб ня даць літоўцам поваду для далейшых інтрыгаў, у гэтай рэзалюцыі зусім не ўспомняна аб Вільні і віленскім пытаньні наагул, быццам яно ня істнуе для Эўропы. Гэта лепшы доказ поўнай паражкі літоўскай дыплёмацыі ў Жэнэве. I вялікую абмылку зробяць ковенскія дыктатары, калі це падпарадкуюцца з поўнаю шчырасьцю гэтай рэзалюцыі, на якую далі згоду перад Лігаю Народаў. Можна комэдыю гуляць, але да пэўнага часу.

N.

ЛІКВІДАЦЫЯ ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКАГА КАНФЛІКТУ.

Адбыўшаяся у Жэнэве чарговая сэсія Рады Лігі была пасьвечана выключна польска-літоўскаму канфлікту. На гэту сэсію прыбыў нават Маршалак Пілсудзкі, адбыўшы конфэрэнцыі з Брыянам, Чэмбэрленам і Штрэзэманам. Затым на ўнёсак галяндзкага дакладчыка Радаю Лігі Народаў была прынята наступная рэзалюцыя:

„Рада Лігі прызнае, што ваенны стан між Польшчаю і Літвою спыняецца. Польшча прызнае палітычную незалежнасьць і тэрытарыяльную нятыкальнасьць Літвы. Рада Лігі Народаў прапануе польскаму і літоўскаму ўрадам распачаць безпасрэднія гутаркі з мэтаю наладжаньня мірных адносінаў. Абжаленьне літоўскага ураду на адміністрацыйны загад адносна літоўскай меншасьці будуць перададзены на разгляд камісіі Рады Лігі, якая прадставіць Радзе справаздачу ў адпаведны час. У выпадку небясьпекі ваенных канфліктаў пагражаемая старана зьвяртаецца да Рады Лігі Народаў за застасаваньнем перасьцярагаючых сродкаў. Рада Лігі Народаў ухваляе, што гэта рэзалюцыя не датычыць тых спорных пытаньняў, якія істнуюць між абудвыма урадамі".

Па прачытаньні гэтай рэзалюцыі міністар Залескі ад імя Польшчы заявіў, што прыймае яе. Потым гэта зрабіў і літоўскі прэм'ер Вальдэмарас. Абудва міністры у сваіх прамовах дзякавалі Лігу Народаў і адзін другога за праяўляную добрую волю і вуступчывасьць, падаўшы друг другу рукі. Пасьля гэтага Маршалак Пілсудзкі устаў з мейсца і, павітаўшыся з сябрамі Лігі Народаў і Вальдэмарасам, выйшаў з салі. У кулюарах Маршалак доўга гутарыў з Чэмбэрленам і ягонаю жонкаю, пасьля чаго выехаў да свайго гатэлю. Перад выездам з Жэнэвы Маршалак Пілсудзкі ў гутарцы з кар. „Matin'a" заявіў, што ён застаўся зусім задаволены вынікамі конфэрэнцыі па польска-літоўскаму пытаньню. Ен хацеў пачуць толькі адно слова „мір". І гэта слова ён пачуў.

БЕЗПАСРЭДНІЯ ПЕРАГАВОРЫ ПОЛЬШЧЫ З ЛІТВОЮ.

У выніку ліквідацыі польска-літоўскага канфлікту міністры Залескі і Вальдэмарас злажылі ўзаемна візыты. У часе гутарак былі закрануты паважнейшыя справы. Мейсцам спатканьня дэлегатаў абудвых старон і вядзеньня безпасрэдніх перагавораў на падставе рэзалюцыі Рады Лігі накрэсьляна адна з сталіцаў Прыбалтыйскіх Рэспублікаў. Вызначэньне аканчальнага тэрміну і праграмы працы будучай конфэрэнцыі адложана да хвілі згоды міністраў з сваімі ўрадамі. У кожным разе перагаворы гэтыя распачнуцца у пачатку наступнага году.

Перасьцярога Белар. Грамадзянству!

Прайдзісьвет.

Беларускае грамадзянства пэўне са зьдзіўленьнем спатыкала час ад часу прозьвішча нейкага Аўгэна Міткевіча, якое зьяўлялася то на шпальтах грамадаўскіх антыдзяржаўных часопісяў, то ў польскіх газэтах, у вернападданых дэпэшах, то пры шчырых „падзяках старостам у апецы“, то ў калектыўнай лістоўцы побач з прозьвішчамі ўжо зусім выразных камуністых і г. д.

З тае прычыны, што асоба гэтая — Аўгэн Міткевіч, якімсь дзіўным зьбегам акалічнасьцяў пачынае рухацца ўжо значней на Баранавіцкім грунце, лічым патрэбным ніжэйшым папярэдзіць беларускае грамадзянства што датычна асобы гэтага Міткевіча. Перад усім некалькі слоў з прошласьці гэтага пана.

Сын дзячка, без усялякай адукацыі, пасьля вайны ўзьбіўся на пасаду тэлеграфістага ў Менскай паштова-тэлеграфічнай канторы. Але як прыйшоў бальшавізм, дык А. Міткевіч зьяўляецца ўжо камісарам пошта-тэлеграфу ў Менску!.

Потым раптам бяжыць у Польшчу (ад бальшавікоў!) і, як кажуць б. менскія паштовыя служачыя, з прычынаў выключна „фінансавых“... (нешта было з касай!).

Далей Міткевіч нейкі час блутаецца ў Варшаве, прабуе ўлезьці ў даверра нябошчыка Б. Савінкава, але адтуль выганяецца. Бліжэй сходзіцца з вядомым Дзяргачом, з якім разам уступае ў сувязь з расейскімі манархістамі на чале з гэнэралам Новінкавым. Міткевіч вельмі энэргічна вядзе з манархістамі „працу“, „гатуючы паўстаньне“ проці бальшавікоў, як раптам ўсе манархісты аказваюцца арыштаванымі і высланымі ў 24 гадзіны ў Гданск, адзін толькі Міткевіч на свабодзе!...

Наступным этапам „дзейнасьці“ А. Міткевіча зьяўляеццца Горадня, дзе ён творыць нейкіх „актывістаў“. З гэтымі „актывістамі“ ён лоўка ўцірае акуляры б. гэнэральнаму штабу і вось мы бачым ўжо Міткевіча бяручым удзел у выбарчай акцыі ў Сойм на тэрэне Наваградчыны. Ен разам з сваім дзесяткам гэтых, прыехаўшых адкульсь малайцоў — „актывістаў“ прабуе разьбіваць беларускую еднасьць! Ен фігуруе нават, як *беларус* (праўда на абсолютна безнадзейным мейсцы), але за тое на польскім лісьце N 22 на 4-м мейсцы пасьля пястоўца Крашэўскага, асадніка Чарноцкага і буйнага абшарніка Крупскага.

Змагаецца адначасна, ўжываючы недапусьцімых з боку этычнага мэтадаў з адзінай тагды чыста беларуска-нацыянальнай беларускай групай „Беларускім Безпартыйным Сялянскім Саюзам“, на чале якога стаяў раённы доктар з Сіняўкі А. Паўлюкевіч. Гэтая беларуская група, маючая з аднаго боку варожую 16-ку, а з другога адналіты польскі фронт з здраднікам беларусам Міткевічам, мусіла з сваім беларускім нацыянальным сялянскім сьпіскам зусім выступіць з акцыі выбарчай, з якой прычыны з Наваградчыны апрача 2-х беларусаў прайшло з „16“-кі 2-х жыдоў! Народ беларускі не падаўся ашуканству здраднікаў — беларусаў, якія за юдавыя грошы хацелі ад беларускіх земляў і *беларускімі галасамі* правясьці ў Сойм: пястоўца, асадніка і абшарніка! Сьпісак № 22 разам з актывістам Міткевічам не адтрымаў аніводнага мандату!

Праваліўшыся, актывіст Міткевіч зноў варочаецца ў Горадню, дзе за „вэрную службу“ робіцца кіраўніком „Беларускага Горадзенскага прытулку“ пры „Беларускім Горадзенскім Добрачынным Таварыстве“, якое адтрымлівала сталую грашовую ўрадовую запамогу. Але праз вельмі нядоўгі час выключаецца пратаколам паседжаньня Дабрачыннага Т-ва з пасады і скіроўваецца да пракурора па абвінавачаньню Таварыствам у растраце і крадзежы (прыўлашчэньні) прытулковых грошаў больш тысячы злотых і апыняецца ў турме.

Як ён выбраўляецца адтуль, няведама. Але праз пэўны час крымінальная справа Міткевіча нейк заціхае... Як з ёй, што і дзе, *дакладна* беларускае грамадзянства гэтак і не даведалася.

Аднак-жа з тае прычыны, што ўраду Т-ва, які зусім выразна пратакулярна абвінавачваў Міткевіча ў растраце і іншых машэнствах — Міткевіч да адказнасьці за „безпадстаўнае“ абвінаваньне да гэтага часу не цягнуў і не цягне, дык гэта ёсьць больш як красамоўным!

Далей Міткевіч у хуткім часе побач з сваім шчырым і верным прыяцелем Ф. Цяўлоўскім арганізуе ў Горадні разам з нейкім Федаравым, Балдоўскім і іншымі „Акружны Горадзенскі Камітэт па беларускім справам“. Гэты камітэт на чале з сваім старшынёю Балдоўскім амаль не цалком трапляець да турмы за шпіёнства, дзе „калегі“ Міткевіча і Цяўлоўскага Балдоўскі і Федараў дагэтуль сядзяць у турме.

Больш у Горадні быць не магчыма і вось „горадзенец-актывіст“ Міткевіч раптам апынуўся на кірмашу ў Барановічах, дзе адчыніў бюро паданьняў.

Трэба прызнаць, што спрыт і здольнасьць і тут ратуюць Міткевіча. Яму, ня гледзячы на гэткую *громкую* мінуўшчыну, праўда пасьля доўгіх хлопатаў, відаць за *старыя заслугі*, удаецца здабыць права абаронцы, ў той час як ён ня мае абсалютна ніякіх кваліфікацыяў для абаронцы ні з боку практыкі, ні тым балей з боку тэорэтычнай падгатоўкі, ня маючы хаця-бы сярэдняй адукацыі.

Але ёсьць прыказка: „не радзіся багатым, а радзіся шчасьлівым“. І вось Міткевічу зноў „вязе“. Ідуць выбары ў самаўрадавыя ўстановы. Міткевіч прабуе ўбіцца ў якую-небудзь групу, але яго нікуды не бяруць. Беларусы з Баранавічаў праводзяць пяць сваіх сябраў да Рады Магістрацкай. Аб Міткевічу ня было і мовы. Але вось трэба было Сойміку Баранавіцкаму выбраць свой выдзял павятовы. Беларусы падзяліліся, бо кажуць, кожны хацей быць у выдзяле, а тым часам *галасамі палякаў* (бо беларускія баранавіцкія Радныя яго кандыдатуры не выстаўлялі!) дый якімсь цудам выбраны сябрам выдзялу Міткевіч!...

Зноў павязло.

Тут Міткевіч, апьянеўшы ад пасьпеху, страціў аканчальна галаву і думаючы, што ўся ягоная папярэдняя „дзейнасьць“ ці забыта, ці ў Баранавічах няведама, пачаў зноў сваю старую баламутную працу. Крычачы, што ён *радны*, (хаця гэта няпраўда!), ён пачаў сваю шкадлівую разьбіваючую працу сярод радных—беларусаў. Пачаў ад таго, што рабіў дарэмныя высілкі сарваць „Першы Зьезд Радных Беларусоў у Вільні“, дзе побач з камуністамі і грамадаўцамі падпісаў паскудную адозву. Ягонага прыяцеля Мамоньку, які прабаваў раскідаць гэтую пакасную адозву, абураны зьезд проста выгнаў вон з салі. Усім падпісаўшым гэтую адозву зьезд аднагалосна пастанавіў выразіць сваю ганьбу.

Праваліўшыся ў Вільні, Міткевіч вярнуўся ў Баранавічы, дзе прабуе прадаўжаць сваю цёмную працу. Баламуціць радных, а так-жа сялян, якім *нічога* ня ведама аб *здрадніцкай* прошласьці Міткевіча. Але ўся ягоная энэргія скіравана перад усім проці чыстых беларускіх нацыянальных арганізацыяў, як Беларуская Нацыянальная Рада і Партыя, „Прасьвета“ і „Беларускі Камітэт па справам Самаўрадаў“. Гэтыя арганізацыі маюць тысячы з'арганізаваных сябраў. („Прасьвета“ мае 100 аддзелаў, 84 бібліатэкі, 1 Народны дом, 12 тэатральных трупаў і 4 беларускіх нацыянальных хора. Бел. Нац. Партыя і Рада маюць да 2,000 сябраў, а Бел. Камітэт па справам Самаўрадаў 198 сябраў, сярод якіх знаходзіцца 5 першых беларускіх войтаў, 12 заступнікаў войтаў і 26 сябраў соймікаў). А Міткевіч *ніколі нідзе нічога* для беларускага нацыянальнага руху не зрабіў, *не належачы да ніякай з існуючых бел. арганізацыяў*! Заўсёды толькі разьбіваў, здраджаў, служачы якімсь няведамым мэтам, але ясна шкадлівым і варожым, як Беларускаму адраджэнчаму руху так і Беларускаму Народу.

Перад гэтым здрайцам і прайдзісьветам папераджаем ўсіх Беларусаў!

Перад выбарамі да Сойму і Сэнату.

У „Dzienn. Ustaw Rzplitej“ № 107 з дня 5 сьнежня г. г. апублікавана наступнае распараджэньне п. Прэзыдэнта Рэспублікі з дня 8 сьнежня 1927 г., аб выбарах у Сойм і Сэнат.

„На аснове арт. 13 ардынацыі выбарчай у Сойм, зьмешчанай у законе з дн. 28 ліпня 1922 г. (Dz. U. Rz. P. № 66 poz. 590), а такжа арт. 9 ардынацыі выборчай у Сэнат, зьмешчанай у законе з дн. 28 ліпня 1922 г (Dz. U. Rz. P. № 66 poz. 591), загадваю выбары у Сойм і Сэнат Рэспублікі. Галасаваньне у Сойм адбудзецца 4 сакавіка 1928 г., а у Сэнат 11 сакавіка 1928 г. Выборныя чынасьці маюць быць выканаты у тэрміны, абазначаныя у далучаным да гэтага распараджэньня выбарчым календары.

(—) Прэзыдэнт Рэчыпаспалітай
І. Масьціцкі.

(—) Старшыня Рады Міністраў
І. Пілсудзкі.

(—) Міністар Юстыцыі
Мэйштовіч.“

У тым-жа N „Dz. Urz.“ паданы наступны выбарны календар.

ВЫБАРЧЫ КАЛЕНДАР.

13 сьнежня б. г. — 8 найбольшых па ліку клюбаў пасольскіх прадставіць Гэнэральнаму выбарчаму камісару 8 сябраў Дзяржаўнай выбарнай камісыі і столькі-ж заступнікаў іх.

15 сьнежня б. г. Гэнэральны выбарны камісар, на прапазыку прэзэса адноснага Апэляцыйнага Суду вызначае прэзэсаў акружных выбарчых камісыяў. Ваявода, Камісар Ураду — вызначае па 1 сябру Акружных выбарчых камісыяў,

Адміністрацыйныя Улады І інстанцыі аб'яўляюць ува ўсіх гмінах аб іх падзеле на выбарчыя абводы, аб выбарчых памешканьнях і памешканьні выбарчай абвадовай камісыі. Адначасна тая самая Улада паведамляе аб гэтым прэзэса Акружнай выбарчай камісыі і Галоўны Статыстычны Урад. Гэнэральны выбарчы Камісар аб'яўляе у „Monitorze Polskim“ аб складзе асобаў і урадавым памешканьні Дзяржаўнай выбарчай камісыі, а такжа аб мейсцы, часе, спосабе і апошнім тэрміну прад'яўленьня гасударственных сьпіскаў кандыдатаў.

17 сьнежня. Гэнэральны Выбарчы Камісар аб'яўляе у Ваяводзкім „Dzienniku Urzędowym“ аб вызначаных прэзэсах акружных выбарчых камісыяў і іх заступніках; Ваявода, Камісар Ураду — аб'яўляе аб вызначаных сябрах Акружных выбарчых камісыяў.

Гарадзкія Рады, сабраньні начальнікаў гмінаў выбіраюць сябраў Акружнай выбарчай Камісыі.

19 сьнежня. Прэзэс Акружнай Выбарчай Камісыі аб'яўляе асабовы склад камісыі у Ваяводзкім „Dzieuniku Urzędowym“. Акружная Выбарчая Камісыя аб'яўляе ўва ўсіх гмінах аб дню выбараў, гадзінах галасаваньня, ліку паслоў, якія маюць быць выбраны на Акрузе і часе, спосабе і апошнім тэрміну прадстаўленьня кандыдатаў і заяваў аб далучэньні акружнага сьпіску да сьпіску гасударственнага, а такжа аб асабовым складзе і памешканьні выбарчага Ураду.

20 сьнежня. Валасная Рада, альба сабраньне солтысаў, альба Камісар Ураду, альба паветовы выдзял вызначае 3 сябраў абводовай выбарчай Камісыі і столькі жа іх заступнікаў.

25 сьнежня. Начальнікі гмінаў (прэзыдэнты, бурмістры, войты, заведуючыя даменіальнымі абшарамі) укладаюць для кожнай мейсцовасьці сьпісак выбаршчыкаў у 3-х экзэмплярах.

Прэзэс Акружнай Выбарчй Камісыі паведамляе начальніка гміны аб складзе адносных абводавых выбарчых камісыяў і падае аб гэтым да агульнага ведама.

27 сьнежня. Начальнік гміны перасылае 3 экзэмпляры сьпіскаў выбаршчыкау прэзэсу Абводовай Выбарчай Камісыі.

1 студня 1928 г. Абвадовая Выбарчая Камісыя перасылае 1 экзэмпляр сьпіску выбаршчыкаў Акружнай Выбарчай Камісыі.

2 студня 1928 г. Абводовая выбарчая Камісыя выстаўляе сьпіскі выбаршчыкаў для публічнага перагляду.

15 студня. Апошні дзень выстаўленьня сьпіскаў выбаршчыкаў для публічнага перагляду.

16 студня. Апошні тэрмін падачы да Абвадовай Выбарчай Камісыі рэклямацыяў проці непамешчаньня у сьпіску, альба памешчаньня кагосьці, ня маючага на гэта права.

22 студня. Апошні дзень падачы аб'ясьненьняў проці рэклямацыяў аб выкрасьленні са сьпіскаў.

24 студня. Прадстаўленьне гасударственных сьпіскаў кандыдатаў.

27 студня. Абвадовыя выбарчыя камісыі перасылаюць акружнай выбарчай камісыі экзэмпляры сьпіску выбаршчыкаў.

30 студня. Абвадовыя выбарчыя камісыі прысылаюць аб'ясьненьні проці выкрэсьленьня выбаршчыкаў са сьпіскаў і пера-

Лермантаў па беларуску (II).

(Крытычны агляд перакладу поэмы „Мцыры“).

(*Працяг. Пачатак глядзі у № 36-ым „Б. Сл.“*)

Шмат горш стаяць справы у чарговай главе IV-ай, у пачатку якой п. К. ўкладае ў вусны Мцыры гэткія словы:

„Нікому я *ня мог* (?) сказаць,
„Як бацьку й маці трэба зваць“.

З гэтага можна было б падумаць, што Мцыры ніколі ня ведаў ды ня бачыў сваіх бацькоў, тымчасам са зьместу поэмы бачым, што наадварот, частку сваіх дзіцячых гадоў ён скаратаў у роднай хаце і толькі, калі ён меў ўжо год каля шасьцёх, відаць пасьля крывавай спатычкі расейскаго атраду з жыхарамі ягонага аулу, забраў з сабой асірацелага хлапца расейскі гэнэрал.

І сапраўды ў арыгінале бачым тут нешта зусім іншае, а ласьне:

„Я никому не мог сказать
„Священных слов „отец“ и „мать“.

Ці-ж гэтыя словы маюць азначаць, што Мцыры ня толькі у сучаснасьці але-й *ніколі* ня меў нагоды казаць тых „священных“ найменьняў, зьвяртаючысь да бацькоў?

Пэўне-ж, што не! Ен быў пазбаўлены гэтае магчымасьці толькі з тае пары, як забраў яго з сабой гэнэрал і пакінуў у манастыры, а раней гэтая магчымасьць у яго была ды-й на'т давелі доўга! Далейшыя строфы арыгіналу пацьвярджаюць гэтую тэзу:

„Конечно, ты хотѣл, старик,
„Чтоб я в обители *отвык*
„От этих сладостных имён“

кажа Мцыры, — значыць раней ён ведаў гэтыя імёны і меў іх каму казаць?!

(Поўнае пацьверджаньне гэтых нашых вывадаў чытач можа знайсьці у далейшай главе VII-май арыгіналу).

Заняўшы ад самага пачатку главы абмылковае становішча, перакладчык у далейшым яе працягу вярзе што раз то большыя недарэчнасьці; гэтак чытаем далей:

„Я ў іншых бачыць мог радню,
„Айчыну й дом, што так цаню,
„А сам заўсёды (?!) быў адзін
„І навет мілых дамавін,
„Ня толькі душ(!) свае радне,
„Не давялося (?) знаці мне“.

Калі ў арыгінале:

„..... Я видѣл у других
„Отчизну, дом, друзей, родных,
„А у себя не находил.
„Не только милых душ — могил!“

Быццам тое самае, але ня тое! Бо тады, калі ў арыгінале ўсё гэта адносіцца *выключна толькі* да пэрыяду прымусовае падарожы Мцыры ды-й пабыту ягонага у манастыры перакладчык робіць з гэтага сталы, *заўсёдны* стан рэчаў!!

Ўрэсьце ў самым канцы гэтай-жа главы IV-ай знаходзім яшчэ адзін прыкры *lapsus*, перакладчыка, бо тады як ў арыгінале ў тым мейсцы, дзе Мцыры, кажучы аб сваей тузе па родным доме і аб сваей пастанове пабачыць кагось з застаўшыхся пры жыцьці сваякоў ягоных, (з якой мэтай ён ласьне і ўцёк),—сьцьвярджае *толькі* няўдачу сваіх намераў — лятуценьняў:

„Увы! теперь *мечтанья тѣ*
„Погибли в полной красотѣ“

у перакладчыка спатыкаем зусім недарэчны зварот:

„Ды жаль, што *гэта* (?!) ня жыве,
„Сканаўшы ў поўным харастве“,

у якім слова *„гэта“* адносіцца не да лятуценьняў, як можна б было спадзявацца, але да спамянутай крыху вышэй праз перакладчыка *„блізкай душы“*, інакш кажучы — нейкагась сваяка нашага героя!!

Гэтае забаўнае „нахаўтураньне“ сваяка замест лятуценьняў, даказвае яшчэ раз, што перакладчык, бяручысь за працу, не задаў сабе труду прадумаць як сьлед як агульнага зьместу поэмы (яе фабулы), гэтак і уласьціваго сэнсу ў а п і с а н ь н і паасобных эпізодаў. У пачатку главы V-ай ў страфе:

„А з жыцьцем жаль растацца мне“.

Зьмест папярэдніх строф вымагае перамены „А“ на „ўсё ж“.

Далей перакладчык скалечыў сэнс арыгіналу, пішучы:

„Я вельмі-вельмі малады,
„А ці-ж юнацкія гады
„Калісь ты ведаў (?), ці забыў
„Як ненавідзеў ды любіў...“

бо з гэтых слоў выходзіць што Мцыры пытаўся манаха ці быў ён вагульле маладым, інакш кажучы выходзіць поўная недарэчнасьць, тады як у арыгінале справа йдзе *не* аб самую моладасьць, а *толькі* аб пэўныя яе праявы, якія могуць быць, а могуць і ня быць, залежна ад жыцьцёвых абставін і ўсяго складу псыхікі данага чалавека:

„Я молод, молод... *Знал - ли ты*
„*Разгульной юности мечты?*
„Или не знал, или забыл,
„Кад ненавидѣл и любил“..

пытае Мцыры ў арыгінале.

Добра перакладзена чарговая глава VI-ая і толькі, пры пільнейшым разглядзе там, дзе гутарка йдзе аб *горных хрыбтах* трудна неяк дашукацца сэнсу ў „витьеватом“ штучным звароце:

„Бы мараў сон мой залаты“,

які адносіцца да выгляду спамянутых хрыбтоў і мае адказваць славам арыгіналу:

„Причудливые, как мечты“...

Гэтак сама ня зусім ўдаліся перакладчыку і канчатковыя словы гэтае главы, сэнс якіх выглядае даволі мутна:

„І стала ў памяці *мацней !*)
„Мінулае ясьней, ясьней“...

Дзеля таго што, тэкст арыгіналу у гэтым мейсцы:

„И стало в памяти *моей*
„Прошедшее яснѣй, яснѣй...

не выклікае ані якіх труднасьцяў пры перакладзе дык гэта цяжкае, несуразнае і зацямняючае сэнс „мацней“, ўжытае замест напрашаючагася само-сабой звароту „маей“, можна тлумачыць толькі не заўсёды абаснаваным страхам перакладчыка перад зьлішняй *языковай* набліжаннасьцяй перакладу да арыгіналу.

Даволі добра, хоць ня зусім гладка ў сэнсе вершаваньня ды не надта чыста з боку мовы (бляск, калыбелька), перакладзена і далейшая глава VII-ая.

Далейшыя главы VIII-ая і IX і X-ая перакладзены дасканальна, асабліва-ж VIII-я, ў якой на жаль ёсьць адзін скандальны промах у наступных строфах апавяданьня: Мцыры.

„Вачыма хмары я сачыў,
„Рукой *маланачку* (!) лавіў“...

Гэты здрабнела-ласкальны зварот *„маланачка“*, ўжыты ў адносінах да *грознага* зья-

Раяшнік.

(Справы ўсё тыя ня новыя — выбары Сэймовыя).

Нарэшце ўсім на сьнеданьне — агласіў „Сель-Саюз“ аб‘еднаньне і стварыў гэтак званы — „выбарны Камітэт аб‘еднаны“...

Хто-ж там зьбіраўся і хто аб‘еднаўся?!

Вось тутака і стой! Бо бачыш усюдых адных і тых самых асоб!...

І Ярома з Рагулей, браточкі — былыя паслы галубочкі, што крыкі нясуцца з за крытаў, каб не даваць ім мандатаў...

І іншае „паства“ з „праваслаўнага брацтва“, як Сэнатар былы — Богдановіч, дый з „хадэдаў“ — Каруза, Стэповіч...

І яшчэ вось дзьве пары, але ўсе знаёмыя твары. Бо і ў „клюбе“ яны, і ў „саюзе“, і ў „нац-комскам“ уласном хаўрусе, і толькі з-за гэтае крамы — маўчаць нешта Адамы.

І сьмяюцца, бо ў Сойме яны апынуцца...

—·—

А вось вам шчэ новы хаўрус — „Народны Краёвы Саюз“, што з „вызваленцамі“ ў згодзе ідзе на цябе ўжо Народзе, каб галасамі тваімі скарыстацца і паціху ў Сойм ужо прабрацца.

Але-ж паночкі — з „Бел-Дня“ галубочкі! Навашта-ж так сумаваць, што ўсе пачалі нагадаць на „Саюз“ ваш „Краёвы“, які для Народу зусім не вядомы?...

Калі беларускасьць сваю пахавалі, дык аб гэтым даўней ўсе зналі...

—·—

А вось і „спадар“ прабудзіўся і з „Народам“ ізноў паявіўся, бо да Сойму мандаты віддаць ужо нікаму не даюць спаць...

Ой, цяжка ўжо без мандата! Пачнуць „калашмаціць“ брат-брата...

Але Народзе! Будзь-жа Ты асьцярожны— ў „окрэс“ вось гэты трывожны!.. А галасаваць калі хочаш бяз „рыску“, дык вібірай кандыдатаў са сьпіску нацыянальнага, да працы рэальнага, бо кандыдаты там будуць знаёмыя, людзі свае павятовыя, якія хоць і маўчаць і мала гамоняць, затое й Цябе абароняць.

Шэйнэ-Катарынка.

сылаюць іх дадаткова да акружнай выбарчай камісыі.

1 лютага. Кандыдаты з гасударственнага сьпіску складаюць прэзэсу Дзяржаўнай выбарчай камісыі заяву аб згодзе на прыняцьце мандату.

3 лютага. Гэнэральная выбарчая камісыя аб‘яўляе у „Monitorze Polskim“ — гасударственныя сьпіскі кандыдатаў; прадстаўленьне акружных сьпіскаў кандыдатаў.

5 лютага. Акружныя выбарчыя камісыі перасылаюць абвадовым выбарчым камісыям 2 экзэмпляры аканчальна зацьверджанага сьпіску выбаршчыкаў, адначасна з гэтым — 3 экзэмпляры гэтых-жа сьпіскаў перасылаюць да начальнікаў гмінаў.

9 лютага. Прэзэсы абвадовых выбарчых камісыяў выстаўляюць аканчальна зацьверджаны сьпісак выбаршчыкаў для публічнага прагляду.

11 лютага. Кандыдаты з акружных сьпіскаў падаюць прэзэсам акружных выбарчых камісыяў заявы аб згодзе кандыдаваць.

Паўнамоцнікі акружнага сьпіску кандыдатаў падаюць прэзэсу акружнай выбарчай камісыі заявы аб далучэньні акружнага сьпіску да сьпіску гасударственнага.

13 лютага. Апошні дзень выстаўленьня для публічнага прагляду аканчальна зацьверджанага сьпіску выбаршчыкаў.

21 лютага. Акружныя выбарчыя камісыі дастаўляюць абвадовым выбарчым камісыям афішы з сьпіскамі кандыдатаў для расклейкі гэтых афішаў.

4 сакавіка галасаваньне у Сойм.

7 сакавіка паседжаньне акружнай выбарчай камісыі з мэтай установленьня рэзультатаў.

11 сакавіка галасаваньне у Сэнат.

14 сакавіка паседжаньне акружнай выбарчай камісыі з мэтай ўстаноўленьня рэзультатаў выбараў у Сэнат.



Літоўскі прэм‘ер Вальдэмарас.

ВЫЗНАЧЭНЬНЕ ГЭНЭРАЛЬНАГА ВЫБАРЧАГА КАМІСАРА.

Дэкрэтам Прэзыдэнта Рэспублікі ад сьнежня вызначаны: віцэ-міністр міністэрства юстыцыі Ст. Цар — Гэнэральным Камісарам Выбарчым і віцэ старшыня апэляцыйнага суда у Варшаве Ф. Дуткевіч — заступнікам Гэнэральнага Выбарчага Камісара.

ДЭЛЕГАТЫ ДА ГАЛОЎНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ.

13 сьнежня скончыўся тэрмін вызначэньня 8 палітычнымі партыямі кандыдатаў на сябраў Галоўнай Выбарчай Камісіі. Кандыдатам Z. L. N. вызначаны Савіцкі, Ch. D. — Качынскі, Ch. N. — кс. Выржбоўскі, Пяста— Урбановіч, Вызваленьня — Багінскі, P.P.S.— Ушак і ад жыдоў — Гарцігляс.

НАУКОЛ БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

Утвор п. Грунбаума — блёк нацыянальных меншасьцяў клеіцца ня зусім гладка. Ня гледзячы на узможаную агітацыю паасобныя жыдоўскія групы устрымліваюцца ад удзелу у блёку, выказваючыся за стварэньне агульна-жыдоўскага выбарчага блёку. Ужо выказаліся проці блёку меншасьці дзьве вялікія жыдоўскія групы, а ласьне дробных купцоў і рамесьлянікаў. Сярод Украінцаў толькі „УНДА“ зьвязалася з Грунбаумам.

ДРОБНЫЯ ЖЫДОЎСКІЯ ГАНДЛЯРЫ ПРОЦІ БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯЎ.

На гэтых днях адбылося ў Варшаве паседжаньне цэнтральнага камітэту дробных жыдоўскіх купцоў з удзелам 29 дэлегатаў з ўсей Польшчы. Пасьля ажыўлёных дэбатаў ухвалянa прыняць папярэднюю ухвалу выканаўчага камітэту гэтай арганізацыі, выказваючайся проці удзелу дробных жыдоўскіх гандляроў у агульным блёку нацыянальных меншасьцяў, а замест гэтага за удзел у блёку чыста жыдоўскім.

КАМУНІСТЫЯ ВЫСТАВЯЦЬ АСОБНЫ СЬПІСАК.

„Robotnik“ падае вестку, што камуністыя рашылі выставіць на будучых выбарах свой уласны сьпісак.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

УЗРОСТ БЕЗРАБОЦЬЦЯ.

Лік безработных у Польшы паволі павялічваецца. 3 сьнежня зарэгістравана безработных 176,681. Безрабоцьце павялічылася на 26,074 чалавекі.

ГАНДЛЕВЫ ДЭФІЦЫТ.

Гандлёвы балянс за лістапад паказвае 13 міл. зл. залатых дэфіцыту.

ДАЎГАТЭРМІНОВЫЯ КРЭДЫТЫ ДЛЯ РАЛЬНІЦТВА.

У бліжэйшы час будуць адчынены даўгатэрміновыя крэдыты для ральніцтва на агульную сумму ад 20 да 30 мільёнаў зл. Пазыкі гэтыя часткова будуць вызначаны з амэрыканскай пазыкі на гаспадарчую адбудову. Выдаваць іх будзе спэцыяльная камісія пры Польскім Банку.



Старшыня радавай дэлегацыі ў Жэнэве Літвінаў.

Да згоды.

Як ты шчыры беларус,
Дык зрабі, як маці
У Саламона на судзе
Для свайго дзіцяці.
„Не судзьзя, аддай дзіця
Ты ляпей суседцы.
Хай нявінная тут кроў
З-за мяне ня льецца“.
А не то што маць „эрзац“:
„Разсячы нам роўна“
Бо чужое ёй яно —
Сэрцу ўсё роўна.
Так і вы вось, главары
Нашай Беларусі,
Нас рвецё так на кускі,
Як та маці мусі.
З вас напэўна мала хто
Чалавек „тутэйшы“,
А найболі „тоже“, „teź“
Беларус шчырэйшы.
Ох хо-хо... каб мы былі,
Як цар Саламоне,
Дык адразу панялі-б,
Хто праўду гамоне.
І пашлі б за імі радным,
Як у вырай гусі,
А то трудна распазнаць
Вас на Беларусі:
Бо адзін, два, многа тры
Партыю складаюць,
І адзін перад адным
Да нас дзела маюць.
На‘т і сораму німа,
Што мы ў шарачку,
Падаюць яны руку
І праграмаў пачку.
Не, браток, вазьмі пазад
Гэтыя праграмы,
А ляпей прыклад вазьмі
З гэнай роднай мамы:
Уступі адзін, другі —
Вось і абняліся,
І за працу, як адзін
Разам узяліся.
І на вёсцы нам лягчэй:
Ані хто ня ўб‘ецца,
З абяцанак залатых
Кожны насьмяецца.
Бо ўсё кормяць нас зямлёй
На‘т хто й сам ня мае,
А каб даць, дык трэба мець—
Гэта кожны знае.
Дык да згоды, главары!
Дык да згоды браткі!
Бо хоць кепскі мір — ляпей
Найвялікшай звадкі!

Пётра Лішні.

КАМУНІСТЫЧНЫ ПРАЦЭС у ЛУЦКУ.

10 сьнежня у луцкім акружным судзе закончыўся працэс 34 сябраў камуністычнай партыі Заходняй Украіны, працуючай на Валыні. З гэтага ліку два унявінены, а 32 засуджаны: 10 па 8 гадоў катаржнай турмы, 9—па 6 гад., 2 па 5 гад. 12—па 4 г., 4— па 3 гады, 7 — 2 г. 1 — 4 г. папраўнага дому, 1 — 3 г. папраўнага дому, 3 — 2 г. папраўнага, 1 — 1 г. і 1 — 6 месяцаў. Той час пасьля асуду 24 былі перавезены да турмы на Вронках.

Пашырайце роднае слова!

вішча прыроды, сьведчыць аб недахопе артыстычнага пачуцьця у перакладчыка і абніжае ў значнай меры самае значэньне і павагу гэтага поэтыцкага акту з боку Мцыры, бо, калі, — паводля п. М. К. „маланачка“ гэта нешта такое ручное ды забаўнае быццам „козачка“, дык і злавіць яе не такая ўжо штука!

Каб лепш уявіць сабе ўсю скандальнасьць гэтага „звароту для рыфмы“, раім чытачу паспрабаваць замяніць у папярэдняй страфе гэтага адрыўку слова „хмара“ на „хмарку“, або „хмарачку“ і пабачыць як гэта будзе выглядаць?!

Праўда, што тутака Мцыры братаецца з прыродай, але-ж „братацца“ ды-й яшчэ з чымсь вялікім, зусім ня знача — „фамільярнічаць“!!

А вось для прыкладу пачатак дасканальнага перакладу гэтай-жа главы VIII-ай:

„Ты хочаш ведаць, што рабіў
„На волі я? Павер што жыў.
„І што жыцьцё бяз гэтых дзён.
„Што прамігнулі, нібы сон,
Было-б тужлівей і сумней
„Бязсільнай старасьці тваей.

(Адзначым тут мімаходам што „нібы“ гэта чыстае вады палянізм па беларуску мае быць „быццам“).

У главе XI-ай ізноў-жа немагчыма дашукацца нейкагась сэнсу у апошняй страфе гэткіх слоў Мцыры:

„Усё, што я прачоў тады,
„Усе думкі (сьцёрты іх сьляды)
„Хацеў-бы я хоць расказаць,
Каб думкай жыцьце (?) іх (?!) пазнаць“.

З якіх выходзе, што Мцыры думкай меў назваць жыцьцё думак?!!

І толькі, зірнуўшы ў арыгінал, даведываемся у чым справа:

„Всё, что я чувствовал тогда
„Тѣ думы — им уж нѣт слѣда,
„Но я-б желал их разсказать,
„*Чтоб жить, хоть мысленно, опять*“.

У гэтай-жа бядовай главе XI-ай знаходзім і іншую яшчэ поэтыцкую „красачку“ пана К.:

„А неба ў час нядаўні той
„Было так чыста раніцой,
„Што можна вокам прасачыць
„Як ангел сьветленькі (!!) ляціць“.

Вядома, што беларусы ў штодзенным жыцьці, асабліва ж на вёсцы, любяць ўжываць словы у форме здрабнелай, але гэта ня знача, што гэту вульгарную падчас і вызначную з лішнім мяшчанскім сэнтымэнталізмам манеру трэ‘ тасаваць да поэтыцкіх твораў ды-й яшчэ без усякага разбору і пачуцьця меры, як гэта робіць пан К.!

Калі-б ён меў больш артыстычнага смаку, дык бы зразумеў сам як несмашна — салодкім ёсьць ягоны „сьветленькі“ ангел !!

У гэтай-жа главе XI ай лішне цяжкую страфу:

„Заціхшы голас там навек“

трэ‘б зьмяніць на:

„Голас заціхшы там навек“,

ці штось у гэтым родзе, ды замест

„І я вады ўжо зажадаў“

павінна быць

„І я вады не зажадаў“.

Чарговая глава XII-ая перакладзена добра.

У главе XIII-ай спатыкаем чарговы абсурд перакладчыка, калі, апісваючы хараство маладое грузінкі, якую пабачыў Мцыры каля ручая, ён кажа між іншым наступнае:

„Пагляд вачэй так моцна *цёк*, (?)
„Каханьня поўны быў яе,
„Аж думкі палкія мае
„*Астылі*. (?!!).....“

Сумляваючысь ў тым каб пагляд красуньні мог выклікаць гэткія „нэгатыўныя“ рэзультаты у заваражоным яе хараством юнцы, — глядзім ў арыгінал ну і зразумела знаходзім „маленечкую“ рожніцу, бо тамака сказана гэтак:

„... И мрак очей был так глубок,
„Так полон тайнами любви,
Што думы пылкія мои
„*Смутились* .....“

Ці-ж п. К. гэтак дрэнна ўладае расейскай мовай, што на‘т ня ведае ўласьціваго сэнсу слова „смутились“?! Дык жа-ж не, надварот, ён яе лішне добра ведае, чаму-ж тады гэтак недарэчна тлумача?!...

У гэтай-жа фатальнай главе XIII-ай у канцы знаходзім характарны „сказ для рыфмы“ ў славах:

„Мае ўспаміны *не заснуць* (?)
„Яны ўва мне, са мной памруць“.

Калі ў арыгінале толькі:

„Воспоминанья тѣх минут
„Во мнѣ, со мной пускай умрут“.

Главы XIV-ая і XV-ая, асабліва апошняя, перакладзены добра.

Гэта сама можна сказаць і аб чарговай главе XVI-ай, у якой аднак ёсьць адзін адрывак ня зусім добра змайстраваны, які трэба абавязкава падгладзіць, вось ён:

„Хто-ж бачыць мог мяне? *Хаця*
„Нямыя сьведкі маіх сьлёз:
„Адвечны месячык з нябёс
„Ды лес — магутны сын зямлі,
„*Здаецца*, толькі і былі“.

Нейк тутака ўсё не вяжацца адно з адным, (гэтае „хаця“ у пачатку і „здаецца“ у канцы ды-й іншае), калі ў арыгінале коратка і гладка сказана:

„Кто видѣть мог? Лишь тёмный лѣс
„Да мѣсяц, плывшій средь небес!“

— толькі усяго!!

Главы XVII-ая — XXI-ая перакладзены добра, а мейсцамі на‘т дасканала, ды нажаль нястача мейсца не дазваляе прывесьці тутака найпрыгажэйшых адрыўкаў.

У главе XXII сапсаваны пачатак:

„І гэтак сама як яе (*кветку вастрожную*)
„(Ці чуеш словы ты мае?)
„Паліў да дна, да караня (*каго* !?)
„Агонь бязлітаснага дня“.

— калі тут нейк само напрашваецца: „*паліў мяне*“ (Мцыры), на што указвае і арыгінал,— ў якім сказана:

„И как его, палил *меня*
„Огонь безжалостнаго дня“.

Апошнія главы XXIII-яя і XXIV-ая перакладзены дасканальна і толькі у апошняй з іх XXVI-ай няпрыемна рэжа вуха яскравы палянізм — „бланкітны“ (мае быць: „*блакітны*“.

Гэтым канчаем агляд цэннае працы п. Краўцова, якая будзе яшчэ цэннейшай, калі перакладчык не палянуецца ухіліць істнуючыя у ёй заганы.

Канец.

ЯЗЭП СЬВЕТАЗАР.

Беларусы! Складайце дэкляpацыі.

З ЗАГРАНІЦЫ.

ДЫМІСІЯ ЛАТВІЙСКАГА КАБІНЭТУ.

Латвійскі кабінет Скупенікса падаў да дымісіі, не чакаючы вынікаў галасаваньня сойма па пытаньню аб вотуме недаверра. Пазыцыя левага ураду Скупенікса пахістнулася пасьля падпісаньня гандлёвага дагавору з Радавай Расеяй.

СПЫНЕНЬНЕ ВАЕННАГА КАНТРОЛЮ У АУСТРЫІ.

Аўстрыйскі ўрад атрымаў ад конфэрэнцыі паслоў ноту, у якой паведамляецца аб спыненьні ваеннага кантролю над Аўстрыяй з 31 студня 1928 г.

ВЫПАДКІ У КІТАІ.

Гэн. Шэк, быўшы дыктатар Нанкіну, зноў вярнуўся да улады. Цяпер ён заняты касалідацыяй нацыяналістычнай партыі і стварэньнем нацыяналістычнага ўраду. Ен заявіў, што робіць ўсё залежнае ад яго, каб утрымаць парадак на падпарадкаваннай яму тэрыторыі і хутка распачне паход проці Чанг-Тса-Ліна. Затым, калі бальшавікі ня спыняць сваіх інтрыгаў, дык ён прымушаны будзе разарваць адносіны пры гэтым усе консульствы на падлягаючай яму тэрыторыі будуць зачынены.

У Кантоне выбухлі непарадкі. Цэнтральны Кітайскі банк разбураны. Сытуацыя вельмі паважная. Тэлеграфная камунікацыя прэрвана. Работнікі і сяляне захапілі уладу ў свае рукі. Чырвоныя вайска у сіле 5,000 занялі усе ўрадовыя гмахі і галоўную кватэру Куомінтангу.

ПАРАЖЭНЬНЕ КАМУНІСТАУ У КІТАІ.

Анты рэвалюцыйныя атрады занялі Кантон, апанаваны камуністамі. На абудвых баках пала каля 4,000 чалавек. Гэн. Чанг-Кай-Шэк аканчальна парваў адносіны з саветамі.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

ПАСТАНОВЫ XV ЗЬЕЗДУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ у МАСКВЕ.

Закончыўшыся у Маскве усерасейскі зьезд камуністычнай партыі аднагалосна пахваліў палітыку Сталіна. Партыйны зьезд канстатуе, што апазыцыя Троцкага па сваей ідэолёгіі адарвалася ад ленінізма і першая рнулася ў меншавіцкую групу. Апазыцыя яўна капітулюе перад сіламі як унутранай, гэтак і загранічнай буржуазыі. Прыймаючы пад увагу, што разгалосіца між камуністычнай партыяй і апазыцыяй з тактычнай перайшла ў праграмную і тая абставіна, што апазыцыя Троцкага стала фактарам у антыдзяржаўнай барацьбе, партыйны зьезд заяўляе, што прыналежнасьць да апазыцыі Троцкага не сумесьціма з пахаджэньнем у радах камуністычнай партыі.

Барацьба з апазыцыяй.

На партыйным зьездзе Яраслаўскі абвінавачываў Каменева у дваабліччы. Калі Каменеў быў сябрам „соўнаркома“, ён сам жадаў застасаваньня самых строгіх сродкаў проці апазыцыі. Ен адкрыта гаварыў, што з апазыцыяй можна бароцца толькі мэтадамі Г. П. У., а цяпер крычыць аб прэсьлядаваньнях. Партыя і радавая улада запраўды павінны бароцца з апазыцыяй пры помачы Г. П. У. Далей Яраслаўскі запэўняў, што апазыцыя вайшла ў сувязь з манархістычнымі групамі. Паводле дакладу Яраслаўскага з партыі выключана 2,030 чалавек апазыцыянэраў і 997 аб'яўляны выгавор. Троцкі на адным з рабочых мітынгаў заявіў, што адбываючыйся зьезд камуністычнай партыі нікога ня цікавіць дзеля таго, што зьяўляецца конфэрэнцыяй толькі сталінскай фракцыі. Пастановы зьезда для апазыцыі не абавязковы.

НОВЫЯ КОНТРЭВОЛЮЦЫЯНЭРЫ.

Фішэр і іншыя апазыцыянэры, пасаджаныя ў турму на Лубянцы, пацягнуты да адказнасьці перад вярхоўным трыбуналам па абвінавачаньню ў контр-рэвалюцыі.

ДАБРАЛІСЯ і ДА БЫУШАГА ГАЛОУНАГА КАТА.

Цэнтральная контрольная камісія ухваліла выключыць з камуністычнай партыі камэнданта Крамля Пэтэрсэна, аднаго з залажыцеляў чрэзвычайкі.

ЗАГАДКОВАЕ ЗАБОЙСТВА.

У Маскве шмат гутарак аб загадковым забойстве старага камуністы Калушэк і яго жонкі, які прыймаў удзел разам з Белабародавым у забойстве царскай сямьі. Жонка яго займала пасаду сэкрэтара 'арганізацыйнага бюро Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі. У Маскве ўсе перакананы, што гэтае забойства зьяўляецца справаю рук Г. П. У.

Тутэйшая хроніка.

— **ХВАРОБА НАЧАЛЬНІКА САМАУРАДАВАГА ВЫДЗЯЛУ.** У віду хваробы Начальніка Самаўрадавага Выдзялу Віленскага ваяводзтва п. Ваявода даручыў кіраўніцтва гэтым выдзялам начальніку адміністрацыйнага выдзялу п. Вл. Дваракоўскаму з адначасовым выпаўненьнем сваіх абавязкаў.

— **Выбарчы Рэфэрат пры Віленскім Ваяводзтве.** У зьвязку з загадам Прэзыдэнта Рэспублікі аб выбарах да Сойму і Сэнату п. Ваявода Віленскі стварыў 6 сьнежня спэцыяльны Выбарчы Рэфэрат, які будзе кіраваць усімі адміністрацыйнымі справамі, зьвязанымі з выкананьнем загаду аб выбарах на тэрэне Віленскага ваяводзтва. Выбарчы Рэфэрат мае асобную канцэлярыю пры адміністрацыйным выдзяле Ваяводзтва. Кіраўніцтва Рэфэратам даручана ваяводзкаму радцы п. М. Паўлікоўскаму.

— **Паседжаньне ваяводзкай камісіі адбудовы.** Ад 15 да 17 сьнежня адбыліся паседжаньні ваяводзкай камісіі адбудовы краю. На гэтых паседжаньнях разглядаліся просьбы аб скасаваньні пазык, выданых на адбудову. Датычы гэта пазык, выданых на адбудову ў 1924—25 г. Усяго падана ў гэтай справе 500 просьбаў.

— **Палітычны нябошчык рухаецца...** Дохлы орган бітага па мордзэ Я. Станкевіча „Народ“ (№ 3) зноў пачаў пляваццa пенаю шалёнага сабакі. Ен называе ўсе арганізацыі А. Паўлюкевіча нейкаю „Кучкаю“. Дык прыводзім не для ведама бітага па мордзэ Я. Станкевіча, а тых, хто яшчэ падтрымлівае яго, наступных некалькі лічбаў з н а ш ы х арганізацыяў, якія яскравей усяго высьвятляць брахню вытуранага адаўсюды і атрымаўшага за сваё „эўрапэўскае выхаваньне“ па мордзэ „мішугіна:“ „Беларускае Т-ва Прасьвета“ мае 100 гурткоў з 3,500 сябраў. Камітэт па справам Самаўрацаў лічыць 198 сябраў—радных, войтаў і іх заступнікаў. Яшчэ маладая Беларуская Нацыянальная Партыя лічыць больш 2,000 сябраў і г. д.

А што мае і чым можа пахваліцца Я. Станкевіч, апрача таго, што атрымаў па мордзе і... аблізаўся?!

— **Справы інтэрвэнцыяў:** аб парацкэх у гміне Лужскай Дзісьненскага павету інтэрвэнцыя зроблена і справа высьвятляецца.

Справа праваслаўнага магільніка ў Дунайчыцах Нясьвіскага павету высьвятляецца і п. Старостай забаронена вырубка дрэва на магілках. Справа Сьветавастокава высьвятляецца ў пракурора.

— **ДОБРЫ ПАЧЫН.** Да нас дайшлі весткі, што ў Вільні мае паўстаць Таварыства беларускіх аграномаў. Ініцыятыўная група пасылае інжэнэра А. Малевіча да Варшавы, Львова і іншых местаў для навязаньня беспасрэдняга кантакту з рожнымі гандлёва-прамысловымі фірмамі і аналягічнымі арганізацыямі ў краю. Названая арганізацыя мае быць строга апалітычная і будзе грунтаваць сваё існаваньне на комэрцыйнай базе. У хуткім часе мае вярнуцца на Бацькаўшчыну з Чэхаславацыі каля 10 агрономаў з вышэйшаю асьветаю.

— **АБСАДКА ДРЭВАМІ МЕСТАЎ, МЯСТЭЧАК і ВЕСАК.** Згодна разпараджэньню Міністра Унутраных Спраў ад 2-XI-27 № 453|27 у працягу сакавіка і красавіка 1928 г. распачнецца абсадка дрэвамі пляцаў і вуліц гарадоў, мястэчак і вёсак.

Рынкі і пляцы, якія не маюць гістарычнае вартасьці, будуць з усіх бакоў абсаджаны дрэвамі, а пасяродку апрача дрэваў будуць разьбітыя яшчэ і кветнікі.

Для выкананьня гэтага гміны цяпер унясуць у бюджэт пэўныя сумы, а ў працягу зімы правядуць прыгатаваўчую работу, як замаўленьне дрэвак, нагнаеньне зямлі, закантрактаваньне фахоўцаў — спэцыялістаў і г. д.

— **РАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПРАДУКЦЫЯ ЛЬНУ.** У мэтах павялічэньня прадукцыі льну ў Віленскім і Наваградзкім ваяводзтвах, як найбольш карыснай расьліны на гэтых землях, Міністэрства Ральніцтва стварыла ў Лардунах дасьведчальную станцыю, якая займецца выпрацоўкаю найлепшых сартоў льну для тутэйшых кліматычных варункаў.

— **Фальшывыя 100—златоўкі.** У працягу апошніх дзён у Вільні і паветах віленскага ваяводзтва былі пушчаны ў рух фальшывыя 100 зл. паперкі, якія лёгка можна распазнаць, бо ня маюць вадзяных знакаў, партрэта Касьцюшкі і зроблены з больш тонкай паперы.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Праца „ПРАСЬВЕТЫ“.

(*Баранавічы*).

У нядзелю 12 сьнежня Баранавіцкім аддзелам Т-ва „Прасьветы“ была наладжана беларуская вечарына. Праграма была вельмі цікавая і багатая. Былі адыграны дзьве пьесы: „Суд“ — Галубка і „Зьбянтэжаны Саўка“ — Радзевіча. Абедзьве пьесы былі адыграны сябрамі „Прасьветы“ пад рэжысэрствам сябры цэнтральнай Рады „Прасьветы“ п. Х. Шыбута. Пьесы былі адыграны вельмі добра, асабліва „Зьбянтэжаны Саўка“. Артысткаў і артыстак спаткалі доўгія зусім заслужаныя воплескі.

Наступным пунктам праграмы вечарыны было выступленьне беларускага нацыянальнага хору пад кіраўніцтвам шчырага беларуса і талентнага рэжысэра п. А. Мурашкі. Як родныя беларускія песьні, так і нацыянальная вопратка харыстаў зрабіла пекнае і глыбокае ўражаньне на ўсіх прысутных. Потым выступіла уласная струнная аркестра Баранавіцкай „Прасьветы“, зложаная з балалаечнікаў, мандалістаў і гітарыстаў пад кіраўніцтвам здольнага маладога музыканта — віртуоза сэкрэтара „Прасьветы“ п. Сівака. Канцэрт аркестры распачаўся ад роднаго „Ад веку мы спалі“ і закончыўся нашай „Лявоніхай.“

На закончэньне сябры аддзелу выступілі з дэклямацыяй беларускіх вершаў, пры чым асаблівую ўвагу зьвярнулі ўласныя вершы маладога, пачынаючага народнага паэта п. Шаха. У ягоных вершах чулася праўдзівая, глыбокая любоў і замілаваньне да Маці Беларусі.

Пасьля адбыліся скокі для публікі, шчэльна напоўніўшай вялікае памешканьне, а артысты і хор былі частаваны Урадам Баранавіцкай „Прасьветы“ вячэрай. Прысутным быў прыехаўшы з Вільні старшыня Бел. Нац. Рады А. Паўлюкевіч, які цёпла і шчыра быў вітаны прысутнымі. Роўным чынам гэтак жа шчыра вітаны быў мяйсцовы беларускі самаўрадавы і грамадзкі дзеяч, радны Г. Яроцкі. Падчас вячэры п. Шах прачытаў некалькі сваіх новых вершаў пад гром воплескаў і крыкі „няхай жыве нашы малады поэт Шах!“

Гэтак цёпла, сымпатычна, дружна ў зьеднанай беларускай баранавіцкай сямейцы адбылася вечарына „Прасьветы“.

Няхай-жа жыве „Прасьвета“ і яе маладыя баранавіцкія сябры!

Сябра.

СПЭКТАКЛЬ.

(*Маладэчна*).

8. XII. адбыўся у Маладэчне злучаны Беларуска-Польскі вечар спэктакль, зарганізаваны маладэчанскім гуртком „Прасьветы“. Ставілі 2 п'есы: адна беларуская — „Заручыны Паўлінкі“, другая польская — „Дажынкі“.

У „Заручынах Паўлінкі“ брала ўдзел аматорская белар. трупа з Лебедзеўскага гуртка „Прасьветы“ у складзе Мар'і і Зосі Зеновіч, Уладз. Семашкевіча, Якуба Нехвядовіча, Дзмітры Курыля, Таўстага і іншых, а ў польскім спэктаклі — Маладэчанская трупа у складзе пань Жукоўскай, Яновічуўны, Зардзінуўны, Шумулевічуўны і Скоруўны і паноў Сьледзеўскага, Кулікоўскага, Жукоўскага Голакта і Буйніцкага.

Гралі ўсе добра і выклікалі воплескі. Уражаньне у ўсіх засталося найлепшае. Перад распачацьцем спэктаклю выступіў з прамовай п. Іобэль і між іншым казаў: „За хвілю з гэтай вось сцэны пачуем мы словы беларускія і песьню беларускую, а пасьля быццам рэха паплывуць з гэтай-жа сцэны словы польскія і песьня польская. І мы будзем сьведкамі акта супольнага жыцьця культураў польскай і беларускай, а так сама супольнага жыцьця грамадзянства польскага і беларускага.

Не сумлеваюся, што за сёньняшнім вечарам пойдуць і іншыя акты агульнага жыцьця абодвых грамадзянств будуць павялічвацца і пяройдуць у штодзённае жыцьцё і гэткім чынам супольнае жыцьцё абодвых грамадзянств зробіцца выкананым фактамна вялікае незадаваленьне таго трэцяга, які ад даўнага ўжо часу сварыць паміж сабой два блізкія братнія народы.

Вечар сёньняшні яшчэ і тым ёсьць знаменны, што ёсьць адзіным з першых праяваў новай эры ў адносінах польска-беларускіх і замест аружжа, якое той трэці ўкладываў у рукі нашаму братняму народу, замест ненавісьці паўстае цяпер згода, якую мы вітаем.

Сёньняшні вечар, яшчэ тым ёсьць знаманнейшы, што мы пераходзім у акрэс выбарчы і распачатая цяперашняя тутака згода двух братніх Народаў няхай-жа будзе і ў згоднай нашай ўспулпрацы на полю правадаўства. Няхай жа жыве польска-беларуская згода.“

Прысутны.

Нашае школьніцтва.

(*Вёска Гулі, Пастаўскага пав.*)

Шмат ёсьць аб чым пісаць у нашай вёсцы — ды ніхто не бярэцца, дзеля гэтага я лічу патрэбай асьвятліць свой куток і напісаць аб ім некалькі слоў. Перш за ўсё трэба ўзяцца за школьную справу. Кожны з чытачоў газэт памятае той лік гэтак званых школаў, адчыненых у гэтым школьным годзе. Паміж гэтымі школамі знаходзіцца школа і ў вёсцы Гулі, Жасьнянскае воласьці. Вось я і хачу заявіць перад грамадзянствам на якіх падставах трымаецца ў нас беларусазнаўства.

Вёска наша досьць вялікая і дзяцей шмат, дзеля гэтага ад самага пачатку разьвіцьця школьніцтва школа ў нас існавала (безумоўна польская). Сяляне вельмі не ахвотна пасылалі сваіх дзяцей у чужую школу. Дзеці таксама адчувалі нешта незразумелае ў гэтай школе, дзеля гэтага ніколі да ей не гарнуліся, хадзілі толькі пад прымусам.

Ну і які з гэтага вынік? За васьмі гадовае існаваньне гэтай школы ў цэлай вёсцы лічаныя толькі знойдуцца дзеці, якія атрымалі трох аддзяловую адукацыю. Нават досьць здольны элемэнт дзяцей марнуецца ў адным аддзяленьні па некалькі гадоў. Дзеля таго, што сямілетняе дзіця, якое змушана хадзіць да школы, ня можа ўсвоіць чужое мовы, такім чынам губляе ахвоту да навукі, марнуючы быць можа найлепшыя здольнасьці.

Разумеючы гэта, нашы сяляне ўсімі сіламі стараліся дабіцца сваей роднай школы. У гэтым імкненьні на кожным кроку прыходзілася спатыкаць перашкоды і труднасьці. Войт не хацеў падпісываць дэкляцыяў, інспэктар не зацьвярджаў дзяцей, а найболей імкнулася не дапусьціць сялян да роднай школы нашая вучыцелька Мар'я Наўроцкая. Але сяляне перамаглі, на палову дабіліся таго, да чаго імкнуліся. Але толькі на палову, дзеля таго, што ў гэтым годзе адчынілі школу толькі пад назвай „беларуская“, а фактычна польская. Ну падумайце, браточкі, ці-ж гэта не насьмешка над намі?! У беларускую школу прыслалі тую самую Мар'ю Наўроцкую польскую шавіністку, якая ненавідзіць усё беларускае, на'т ня ўмее ня то чытаць і пісаць, але і гаварыць па беларуску. І яна цяпер застаецца вучыцелькай у беларускай школе!...

Варта ўспомніць аб ей: як і вучыцельцы школы польскай. Праз тры гады калечаньня дзяцей у нашай школе добра яна далася ўзнакі сваей кваліфікацыяй. А каб лепшае мець паняцьце аб яе адукацыі, я прыведу насупны прыклад: селянін В. папытаў у яе колькі ён грошы павінен атрымаць за 15 штук яяк па 11 грошы, калі едучы на кірмаш, 2 разьбіў. „Выкваліфікаваная“ вучыцелька думала, думала і рады не дала. Сказала толькі: „ja takich zadań nigdy nie robiłam“. У асабістай з ей гутарцы я даведаўся, што яна ня мае і з пачатковай школы поўнай адукацыі. Калі я папытаў: як яна дастала пасаду вучыцелькі, то яна адказала: „otrzymała za swoje poświęcenie dla ojczyzny“. Згадзіцца з гэтым можна, што яе вынаградзілі за „poświęcenie“. Ужо два гады насіліся слухі, што яна абавязкава з вучыцельства будзе скінена. Аднак яна, дзякуючы стараньням не дапусьціць сялян да беларускай школы, ізноў заслужылася на вучыцельскі хлеб.

Але варта ўспомніць, як яна вядзе ў нас беларускую навуку. Замест гражданскага друку (кірыліцы) яна ўвела лацініку, што здаецца павінна быць наадварот, бо чытаць лацінікай кожнае дзіця будзе ўмець, вучачыся па польску, а гражданкай не навучыцца нідзе. Такім чынам дзеці нашы пазбаўляюцца магчымасьці паступіць у сярэднія беларускія школы, напр. гімназіі, дзе ўжываецца гражданка. На гэта нашым бацьком трэба зьвярнуць асобую ўвагу. Таксама трэба зьвярнуць увагу на самы спосаб яе начучаньня, бо болей у яе ў школе бывае клят, ніж навукі.

Наагул гэта вялікі сорам цэламу грамадзянству вёскі, што сваю мову аддалі на паневерку чужой шавіністцы.

Гэта ён.

Стрэльцы.

(*Ваўкавыскі пав.*)

У нас у Ваўкавыскім раёне арганізаваліся кулкі Стрэлецкія. Гэтыя кулкі датыкаюцца галоўным чынам моладзі, якая можа падрыхтавацца ваеннаму строю. Таму хлопцу, які ходзіць на вучэньне (якое бывае раз у тыдзень) лёгко будзе служыць і ў салдатах, бо яму ўсё будзе знаёма. Апрача таго ён мае вялікія льготы. А я заўважыў, што толькі польская моладзь ахотна прылучаецца да гэтай арганізацыі і ўжо вучыцца, а наша беларуская моладзь яшчэ думае, яшчэ пасьмяхаецца стоячы з боку

Няўжо-ж вы, хлопцы, ня можаце гэтага зразумець, што гэта для вашай агульнай карысьці, не залежна ад нацыянальнасьці. Дык доўга ня думайце! Усе, як адзін, запісвайцеся ў гэтыя кулкі! Ідзіце рука-аб-руку з польскаю моладзьдзю.

Олесь.

Паштовая скрынка.

Т. Набешко, Н.Салавей, С. Буйка, А. Ананіч, Н Жэбрун, Б. Нікітровіч, Я. Тросьцінскі, Г. Грыгарук — газэты высылаюцца.

Язэп Вашыя карэспандэнцыі будуць зьмешчаны. Пішыце далей.

М. Дудзіч. Газэту высылаем, прысылайце падпіску.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.